Установа “Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры”
Філіял “Літаратурны музей Максіма Багдановіча”

**Даклад**

# Каталог «Аўтографы Максіма Багдановіча» – унікальнасць і значэнне

(зборнік дакладаў дзелавой праграмы форуму “Музеі Беларусі 2022”)

Аўтар:
вядучы навуковы супрацоўнік
навукова-асветніцкага аддзела
Мышкавец Ірына Вітальеўна

Мінск 2023

Мышкавец Ірына Вітальеўна

# Каталог «Аўтографы Максіма Багдановіча» – унікальнасць і значэнне

Галоўная задача супрацоўнікаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча – збор, захаванне, вывучэнне і прэзентацыя асабістай і творчай спадчыны класіка беларускай літаратуры, які так ярка заявіў пра сябе на пачатку XX стагоддзя. Музей быў створаны ў 1981 годзе, калі мінула шмат дзесяцігоддзяў пасля заўчаснай смерці пісьменніка, таму зразумела, што большая частка матэрыялаў з архіва сям’і Багдановічаў паступіла на захаванне ў іншыя ўстановы навукі, культуры, адукацыі Беларусі і замежжа.

Тым больш каштоўнымі з’яўляюцца артэфакты, звязаныя з яго імем, што захоўваюцца зараз ў фондах мінскага музея М.Багдановіча, у тым ліку і восем яго аўтографаў. Менавіта яны і сталі своеасаблівым каталізатарам ідэі аб стварэнні каталога аўтографаў Максіма Адамавіча Багдановіча. Ідэя выдання ўзнікла яшчэ пры падрыхтоўцы да святкавання 120-годдзя з дня нараджэння паэта, але навуковым супрацоўнікам музея прыйшлося прайсці даволі пакручасты шлях. Мэты і задачы былі больш складанымі, чым пры стварэнні звычайнага музейнага выдання, бо неабходна было пад адной вокладкай сабраць выявы ўсіх вядомых на той час аўтографаў пісьменніка.

Задача ўскладнялася тым, што рукапісы беларускага генія паступалі на захаванне ў розныя ўстановы – музеі, архівы, бібліятэкі, якія да таго ж знаходзіліся ў розных краінах, у тым ліку ў Беларусі, Літве, Расіі, Украіне. Як ужо згадвалася вышэй, Літаратурны музеі Максіма Багдановіча ў Мінску зберагае восем каштоўных аўтографаў пісьменніка: рукапісны зборнік перакладаў уласных вершаў на рускую мову “Зеленя”, вершы на адваротным баку фотаздымкаў, інскрыпты на кнігах, часопісных адбітках, дзённікавыя запісы. Акрамя Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, у пералік уладальнікаў каштоўных рукапісаў на сённяшні момант уваходзяць наступныя ўстановы Рэспублікі Беларусь: Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Найбольшая колькасць каштоўных рукапісных памятак захоўваецца ў Літве, у Бібліятэцы імя Урублеўскіх Акадэміі навук Літвы і ў Літоўскім цэнтральным дзяржаўным архіве. У рукапісным аддзеле бібліятэкі зберагаюцца вершы, пераклады, фрагменты крытычных артыкулаў Максіма Багдановіча, лісты пісьменніка да рэдакцыі часопіса “Маладая Беларусь”, дзе ён марыў публікавацца, і да рэдакцыі газеты “Наша Ніва”, з якой плённа супрацоўнічаў. У архіве захоўваюцца два лісты М.Багдановіча ў рэдакцыю

газеты “Наша Ніва”, іх каштоўнасць у тым, што яны з’яўляюцца найбольш раннімі ў эпісталярнай спадчыне пісьменніка і гавораць аб яго цікавасці да беларускай перыёдыкі.

Шэсць устаноў навукі, адукацыі, культуры Расійскай Федэрацыі на сённяшні момант з’яўляюцца захавальнікамі каштоўных артэфактаў, звязаных з імем беларускага генія: Архіў А. М. Горкага Інстытута сусветнай літаратуры Расійскай акадэміі навук, Расійская дзяржаўная бібліятэка, Расійскі дзяржаўны архіў літаратуры і мастацтва, Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў, Фундаментальная бібліятэка Яраслаўскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя К. Д. Ушынскага, Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Санкт-Пецярбурга. Ва ўстановах Санкт-Пецярбурга, Масквы, Яраслаўля захоўваюцца рознапланавыя і вельмі цікавыя аўтографы М.Багдановіча. Найбольш каштоўны – рукапісны сшытак перакладаў уласных вершаў на рускую мову – быў выяўлены ў 2018 годзе, літаральна ў часе працы над каталогам. На дадзены момант толькі адзін аўтограф Максіма Багдановіча выяўлены ва Украіне, але каштоўнасць яго немагчыма пераацаніць, бо гэта поўны тэкст артыкула “Краса і сіла”, прысвечанага творчасці генія ўкраінскай літаратуры Тараса Шаўчэнкі.

Праца над каталогам ускладнялася яшчэ і тым, што кожная з краін мае сваю нарматыўна-прававую базу, на якую неабходна было апірацца ў працэсе падрыхтоўкі каталога “Аўтографы Максіма Багдановіча”. Былі праведзены перамовы з кіраўніцтвам кожнай з гэтых устаноў аб атрыманні электронных копій рукапісаў беларускага пісьменніка і дазволаў на публікацыю. Такім чынам, упершыню падрыхтавана факсімільнае выданне рукапісаў пісьменніка з фондаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, фондаў іншых устаноў навукі, культуры, адукацыі Беларусі і замежжа. Кніга ўбачыла свет напрыканцы 2020 года, фактычна стала першым падарункам да юбілею пісьменніка, 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча, якое святкавалася ў наступным, 2021 годзе. Складальнікі каталога – супрацоўнікі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча: М.А.Бараноўскі, М.М.Запартыка, А.У.Кніга, Ю.Б.Мацук, І.В.Мышкавец. Выданне рэкамендавана пратаколам Навукова-метадычнага савета Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, філіялам якога з’яўляецца музей беларускага генія.

Прапануем больш уважліва разгледзець уласна каталог “Аўтографы Максіма Багдановіча”, які складаецца з наступных раздзелаў: I. Аўтографы на фотаздымках. II. Зборнікі вершаў-перакладаў. III. Вершы. IV. Пераклады вершаў. V. Артыкулы. VI. Лісты. VII. Дароўныя надпісы. VIII. Уласнаручныя запісы. IX. Дакументы Мінскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. X. Дакументы Мінскай губернскай харчовай камісіі. Пры размеркаванні аўтографаў у межах таго ці іншага раздзела складальнікі абапіраліся на храналагічны прынцып, зразумела, дзе была магчымасць вызначыць дату ці перыяд напісання. Была праведзена праца па вызначэнні пунктаў археаграфічнага апісання аўтографаў, кожны дакумент прадстаўлены наступным чынам: факсімільная выява аўтографа; кароткае археаграфічнае

апісанне (са спасылкай на крыніцу, паводле якой удакладнялася дата пры яе адсутнасці ў аўтографе); цытаты з успамінаў сучаснікаў Максіма Багдановіча ці з навуковых публікацый, якія змястоўна звязаны з аўтографам. Археаграфічнае апісанне аўтографаў Максіма Багдановіча, уключаных у каталог, прытрымлівалася наступнай паслядоўнасці: найменне (верш, апавяданне, ліст, паштоўка, уласнаручны запіс і г.д.); адрасат (установа альбо асоба) ( пры наяўнасці); месца напісання і дата; від (аўтограф, машынапіс з праўкамі і г.д.); мова; памеры, але яны ўказваліся толькі для рукапісаў, якія захоўваюцца ў музеях; месца захавання арыгінала (установа, пошукавыя дадзеныя).

Такім чынам, каталог “Аўтографы Максіма Багдановіча”, падрыхтаваны супрацоўнікамі мінскага музея пісьменніка, з’яўляецца ўнікальным выданнем, якое сабрала пад адной вокладкай усе вядомыя на сённяшні момант рукапісы класіка беларускай літаратуры. Тут і яго знакамітыя вершы, пераклады з украінскай і французскай моў, артыкулы, прысвечаныя дзеячам беларускай літаратуры і іншых нацыянальных літаратур, інскрыпты на зборніках вершаў “Вянок” і часопісных адбітках, выпраўленні ў тэксце пратаколаў Мінскай губернскай харчовай камісіі, дзе ён працаваў сакратаром, дзённікавыя запісы прыватнага характару і іншае.

Складальнікі каталога палічылі неабходным дадаткам уключыць у выданне ўсе выяўленыя на сённяшні момант факсімільныя выявы аўтографаў Максіма Багдановіча, якія ў свой час публікаваліся ў розных беларускіх і замежных выданнях. Аўтографы значна пашыраюць нашы ўяўленні пра пісьменніка, дазваляюць павялічыць кола навуковых інтарэсаў у галіне багдановічазнаўства, вызначыць перспектыўныя кірункі далейшай пошукавай дзейнасці. Каталог “Аўтографы Максіма Багдановіча” стаў добрым падарунак да 130-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча і 40-годдзя з дня стварэння музея пісьменніка ў Мінску, падкрэсліў пераемнасць музейных традыцый у справе пошуку, захавання і прэзентацыі асабістай і творчай спадчыны генія беларускай літаратуры.

Мышкавец Ірына Вітальеўна,
вядучы навуковы супрацоўнік навукова-асветніцкага аддзела
Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, філіяла
Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры